№ 16 (369)
Красавік 2011 года

Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года

www.bfk.by

У нумары:

☞ Даследуе моладзь: *расповеды пра радзіму* – стар. 2

☞ Асоба ў краязнаўстве: *М. Казлоўскі і яго кнігі* – стар. 4

☞ Атамная катастрофа: *успаміны ліквідатара* – стар. 6

Працяг тэмы на стар. 3

Увага культурным краявідам

18 красавіка Нацыянальны прэс-цэнтр Рэспублікі Беларусь і Міністэрства культуры адзначылі Міжнародны дзень помнікаў і гістарычных мясцінаў круглым сталом, канкрэтызаваўшы тэму «Культурныя краявіды Беларусі – багацце народа і фактар нацыянальнай ідэнтычнасці».

Яшчэ больш удакладніла тэму каардынатар круглага стала А. Статкевіч (Інстытут культуры Беларусі). Яна прапанавала звярнуць увагу грамадскасці на актуальныя пытанні ўваходжання Беларусі ў міжнароднае прававое кола аховы культурнай і прыроднай спадчыны, а таксама далучэння краіны да Еўрапейскай канвенцыі аб краявідах (ландшафце), заключанай у Фларэнцыі ў 2000 годзе.

Мэтаю круглага стала было абмеркаванне праблемаў захавання культурных ландшафтаў ад адмоўнага ўздзеяння ўрбанізацыі і глабальных эканамічных зменаў, удасканаленне дзяржаўнай стратэгіі ў накірунку зберажэння помнікаў і гістарычных мясцінаў. І ў першую чаргу гэта тычыцца традыцыйнага агракраявіду: захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны, а таксама праблемы захавання і выкарыстання комплексных гісторыка-культурных каштоўнасцяў, якія складаюцца з культурных і прыродных аб'ектаў.

Вельмі глыбока былі абмеркаваныя ўзнятыя пытанні. Выступілі намеснік Міністра культуры Віктар Кураш, намеснік кіраўніка Упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры Аксана Сматрэнка, старшыня Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА Уладзімір Шчасны, старшыня Грамадскай назіральнай камісіі пры Міністэрстве культуры Анатоль Бутэвіч, памочнік старшыні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь Марына Сатоліна і іншыя.

Уладзімірам Гілепам (старшыня ГА «Беларускі фонд культуры») была звернутая ўвага на наступны факт: у нашай краіне Беларускім камітэтам Міжнароднай Рады па помніках і мясцінах (ІКАМОС) ўжо распрацаваны праект Канцэпцыі аховы і мэтанакіраванага фарміравання культурных ландшафтаў Рэспублікі Беларусь, якая пакуль, на жаль, застаецца незапатрабаванай. Была падтрыманая ідэя далучэння Беларусі да названай Еўрапейскай канвенцыі аб ландшафтах і адаптацыі яе да асноўных палажэнняў у нацыянальным заканадаўстве.

Уласны карэспандэнт

Сябры, наступны нумар нашай газеты выйдзе 6 мая. Добрых святаў! Сустрэнемся ў наступным месяцы

Творы з беларускай даўніны

Адразу дзве знамянальныя падзеі ў музычным культурным жыцці краіны адбыліся сакавіцкімі днямі ў Мінску.

17 сакавіка ў камернай зале імя Л. Александроўскай Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь быў прэзентаваны музычна-літаратурны праект «Званы старое казкі», рэалізаваны гэтым тэатрам пры падтрымцы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Ідэйны натхняльнік і кіраўнік праекта – мастацкі кіраўнік «Беларускай капэлы» прафесар Віктар Скорабагатаў. Праца над ім доўжылася больш за два гады, былі адабраныя і перакладзеныя на беларускую мову вакальныя творы сусветнай спадчыны музычнай культуры XVII–XIX стагоддзяў. Карпатлівую працу па адборы твораў правяла Ганна Каржанеўская, а пераклад вершаў да дваццаці вакальных цыклаў сямі кампазітараў зроблены вядомым перакладчыкам лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Васілём Сёмухам. Кніга перакладаў з уступным словам Г. Каржанеўскай і В. Скорабагатава пранямецкую паэзію часоў рамантызму выйдзе ў выдавецтве «Тэхналогія», якое ўзначальвае Зміцер Санько.

Супрацоўнікі "Тэхналогіі" з В. Сёмухам і В. Скорабагатавым

І. Алоўнікаў (злева) і стваральнікі кнігі нотных выданняў

У канцэрце-прэзентацыі «Званоў...», што адбыўся ў рамках XX фестывалю «Адраджэнне беларускай капэлы», у выкананні сталых і маладых беларускіх вакалістаў упершыню на роднай мове прагучалі вакальныя творы Рыхарда Вагнера, Франца Шуберта, Роберта Шумана, Ёганеса Брамса, Густава Малера, Людвіга ван Бетховена.

А крыху раней у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі выдавецтва «Чатыры чвэрці», якім кіруе сябра Беларускага фонду культуры Ліліяна Анцух, прэзентавала 10 кніг з серыі нотных выданняў «Музычная спадчына Рэчы Паспалітай з Расійскай Нацыянальнай бібліятэкі». Серыя выйшла дзякуючы ажыццяўленню міжнароднага праекта Расійскай Нацыянальнай бібліятэкі, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў пры фінансавай падтрымцы Польскага інстытута ў Санкт-Пецярбургу. Гэтую серыю ў 2008 годзе заснаваў кампазітар і даследчык, дацэнт БДУ культуры і мастацтваў Яўген Паплаўскі. Першыя шэсць сшыткаў былі выдадзеныя сумесна з універсітэтам культуры. У галерэі «Лабірынт» народны артыст Беларусі прафесар Ігар Алоўнікаў і ягоныя выхаванцы ўпершыню выканалі інструментальныя творы Антона Абрамовіча, Аляксандра Ельскага, Напалеона Орды, Фларыяна Міладоўскага, Міхала Ельскага, Канстанціна Горскага, Юзафа Ігнацыя Крашэўскага, Каэтана Крашэўскага. Дзякуючы гэтай працы паднятыя дагэтуль невядомыя пласты беларускай музычнай спадчыны XVII–XIX стагоддзяў.

С. АЛАВЕЙКА
Фота аўтара

Конкурс краязнаўчых праектаў

31 сакавіка ў Лінгвагуманітарным каледжы прайшло ўзнагароджванне пераможцаў конкурсу праектна-даследчых працаў навучэнцаў «Мая малая радзіма – 2011». Конкурс праводзіцца з лістапада 2009 года. Яго ўдзельнікі – вучні 2 курса аддзялення «Лінгвістычнае забеспячэнне сацыякультурнай дзейнасці», для якіх гэта першы крок да будучай прафесіі. Працы канкурсантаў ацэньваліся па наступных крытэрыях: творчы падыход, арыгінальнасць формы выкладу матэрыялаў працы; шматаспектнасць, змястоўнасць, усебаковая накіраванасць даследчай дзейнасці па стварэнні праектаў; наяўнасць дакументальна-ілюстрацыйнага матэрыялу (фота-, аўдыё-, відэа-, CD- запісаў і г.д.); практычнае выкарыстанне вынікаў даследчай дзейнасці ў будучай вучэбнай, прафесійнай дзейнасці вучняў.

Старшыня журы конкурсу Зінаіда Кунцэвіч звярнулася да прысутных: «Увесь конкурс – цудоўная магчымасць, па-першае, яшчэ больш даведацца пра розныя куткі нашай радзімы, а, па-другое, – гэта магчымасць і вам пазнаёміцца адно з адным. Конкурс раскрывае і магчымасць здабыць навыкі будучай прафесійнай дзейнасці. Гэта і ёсць яго галоўная мэта. Вы бачылі, што крытэрыі былі складаныя, і тыя, хто ішоў да перамогі, ішоў дастаткова доўга, пачынаў сваю працу яшчэ з мінулага года, але ж і ўзнагароды нядрэнныя. Акрамя тых грамат, што мы ўручаем, рашэннем савета каледжа пераможцы конкурсу атрымліваюць прэферэнцыі пры здачы экзамена па дысцыпліне “Краязнаўства Беларусі”».

Спачатку ўзнагароджвалі ўдзельнікаў конкурсу, што не занялі «прызавыя» месцы ў намінацыях «За навуковы падыход у распрацоўцы тэмы», «За захаванне гістарычнай спадчыны», «За зварот да тэмы Вялікай Айчыннай вайны» і інш.

III месца атрымалі Яна Бабкевіч з праектам «Крывічы – зямля маіх продкаў», Дар’я Дыбоўская, Вольга Лейко, Святлана Сычова з праектам «От конки до метро» і Тамара Базылько, Нігіна Асташэня, Вікторыя Фянчук з праектам «Святые источники Беларуси».

II месца – Яўгенія Вінакурава з праектам «Моя малая родина. Terra Rzeczycensis», Аліна Кугаева і Таццяна Астравух з тэмай «Лида: от Гедымина до современности» і Дар’я Лазоўская і Ірына Шкіндэрава з праектам «Моя малая родина. Корни наши глубокие: Круглянский район». Пасля ўручэння ўзнагародаў гледачы з цікавасцю пазнаёміліся з відэафрагментамі з праектаў дзяўчат.

I месца – Анастасія Васільева і Дзіяна Кіш з праектам «Мотоль как историческое и культурное достояние Республики Беларусь».

Граматы ўручала Таццяна Захаранка, госця з Рэспубліканскага цэнтра турызму і краязнаўства навучэнскай моладзі. Яна павіншавала пераможцаў і пажадала ім поспехаў: «Гэта вельмі прыемна, што вы займаецеся такой працай. Дарэчы, гэты конкурс праводзіцца ў рамках акцыі “Жыву ў Беларусі і тым ганаруся”. Вы, хто прымаў удзел у конкурсе, вельмі багатыя людзі. Вы багатыя тым, што дакрануліся да гісторыі нашай краіны. Калі ў дрэва магутныя карані, то яго любой буры цяжка зламаць. І людзі, якія ведаюць, якія вывучаюць гісторыю сваёй краіны, маюць моцныя карані і яны – багатыя людзі. Усё пачынаецца з павагі, любові да сваёй маці, да сваёй школы, да сваіх педагогаў, да сваёй малой радзімы, а пасля – да сваёй Беларусі. Мне было вельмі цікава глядзець на карту Беларусі, якую вы прыдумалі і на якой запальваюцца зоркі (адзначаюцца тыя куткі Беларусі, якім былі прысвечаныя праекты ўдзельнікаў мінулых конкурсаў). Дык як прыемна, што на ёй зорак стала яшчэ больш».

Шлях да перамогі быў нялёгкі. Удзельнікі конкурсу азнаёміліся з літаратурнымі і гістарычнымі крыніцамі, сустрэліся з людзьмі, якія сталі героямі працаў, падрыхтавалі праекты і паспяхова абаранілі іх. Але найлепшая ўзнагарода – тое, што яны больш даведаліся пра розныя куткі Радзімы, а таксама атрымалі тыя веды, што дапамогуць у жыцці, у будучай прафесіі.

Алесь САЧАНКА
Фота аўтара

P.S. Як заўважана галоўным рэдактарам «КГ» У. Гілепам, толькі адзін праект конкурсу быў выкананы на беларускай мове. Уладзімір Аляксандравіч не разумее, як можна раскрыць тэму «Святыя крыніцы Беларусі», «Мая малая радзіма. Карані нашы глыбокія» ды іншыя, не выкарыстоўваючы родную мову? Краязнаўства без карэннай мовы нацыі ўжо «краеведение». Наш галоўны рэдактар хоча заклікаць вас, дарагія краязнаўцы Лінгвагуманітарнага каледжа, наступны конкурс «Мая малая радзіма – 2012» правесці выключна па-беларуску. І час для гэтага ў вас ёсць. А «КГ» абяцае лепшыя працы апублікаваць на сваіх старонках.

Памёр Алесь Жалкоўскі



14 красавіка 2011 года ў Лідзе абарвалася нітка жыцця вядомага руплівага і таленавітага краязнаўца, журналіста, шчырага змагара за беларускасць **Алеся Жалкоўскага**.

Жыццё – як тонкае лязо. Па ім трэба прайсці так, каб не збочыць, каб не пахіснуцца, каб не зачапіцца і не ўпасці. Прайсці складаны жыццёвы шлях можа не кожны, але ўсё ж ёсць такія асобы. Сярод іх – Алесь Васільевіч Жалкоўскі.

Нарадзіўся Алесь Васільевіч 1 сакавіка 1933 года ў вёсцы Сасновы Бор (да перайменавання Цёмнае Балота) Шчучынскага раёна. Яго беларускія пераканані нарадзіліся тут жа.

Ужо ў 17 гадоў (1950 г.) Алесь Жалкоўскі працаваў адказным сакратаром Васілішскай раённай газеты. У 1961–1962 гг. яму даручылі рэдактарства ў Воранаўскай раённай газеце, а ў 1965–1969 гг. – у Мастоўскай. 1962 год – гэта год прыезду ў Ліду на пастаяннае месца жыхарства. Тут, як дасведчаны майстар журналісцкіх спраў, ён уладкоўваецца ў рэдакцыю лідскай газеты «Уперад», у якой працаваў рэдактарам з 1969-га па 1989 год. Яго імя беларускімі літарамі ззяла не толькі ў раённых выданнях, але і ў абласной газеце «Гродзенская праўда», ад якой быў уласным карэспандэнтам па Лідчыне. А колькі іншых выданняў пакінулі на сваіх старонках яго артыкулы, нататкі, рэпартажы! Яго чытач знаходзіў у «ЛіМе», у «Краязнаўчай газеце», у «Нашым слове», у «Беларускай ніве», у «Лідскім летапісцы», у «Прынёманскіх вестках» ды ў іншых рэгіянальных і рэспубліканскіх перыядычных выданнях.

Алесь Жалкоўскі на працягу жыцця заставаўся змагаром за роднае слова, заступнікам за народ беларускі. Ён неаднаразова з’яўляўся лаўрэатам прэміяў творчых конкурсаў, быў узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета СССР і ганаровым медалём «2000 гадоў Хрысціянству».

З’яўляючыся сябрам Саюза беларускіх журналістаў, ён быў адначасова і сябрам для ўсёй нацыі, для ўсяго народа. Ягоныя сяброўскія пачуцці заўважаліся шматлікімі творцамі. У свой час ён сябраваў з Васілём Быкавым, Уладзімірам Корбанам, Земавітам Фядэцкім… Дзякуючы руплівасці А. Жалкоўскага шматлікія даследчыя працы занялі сваю нішу ў гісторыі беларускай культуры, фальклору, літаратуры.

У апошнія гады, калі раённыя і абласныя газеты сталі больш рускамоўнымі, Алесь Васільевіч не здаўся, не апусціў рук, не здрадзіў роднай мове. І яго беларускасць была настолькі натуральнай, што іншым ён і не ўяўляўся.

Правесці ў апошні шлях Алеся Жалкоўскага прыйшлі і работнікі ідэалагічнага аддзела Лідскага райвыканкама ды старшыня райсавета, і сябры ТБМ ды БНФ. І надпіс на крыжы быў па-беларуску, і большасць вянкоў падпісана па-беларуску. Але самае галоўнае, што калі прыйшла пара на жалобным мітынгу сказаць апошняе «Бывай», унучка Насця развіталася з дзедам на чысцюткай і натуральнай беларускай мове. Не толькі сам пражыў беларусам Алесь Жалкоўскі, але і сваю беларускасць у спадчыну перадаў з генамі і крывёю.

Дык прымі, зямля, свайго роднага сына, будзь яму пухам! Вечная памяць!

Сябры ТБМ імя Францыска Скарыны і літаратурнага аб’яднання «Суквецце»

Фэст экскурсаводаў

Нягледзячы на адмененыя экскурсіі ў Мінску, Фэст экскурсаводаў часткова адбыўся ў рэгіёнах. Экскурсіі на мінулых выхадных прайшлі ў Гомелі, Брэсце, Плешчаніцах і Залессі.

Група, якая патрапіла на экскурсію ў Залессе, атрымала магчымасць апынуцца ў эпосе Міхала Клеафаса Агінскага, прагуляцца па палацы, што знаходзіцца на рэстаўрацыі. Экскурсавод Сяргей Верамейчык (жыве ў Залессі і вывучае гістарычнае мінулае мястэчка) дасканала распавёў пра ацалелыя гістарычныя аб’екты і пра тыя, якіх ужо няма. Нам пашчасціла: на мясцовым возеры мы пабачылі двух лебедзяў, якіх жыхары ласкава называюць «Ля» і «Мінор». Гэта звязанае з назвай знакамітага паланеза М. Агінскага. У Залессі адраджэннем культурнай спадчыны займаюцца і мясцовыя жыхары, у асноўным школьнікі; а кіруе іх дзейнасцю той жа Верамейчык. Сярод мерапрыемстваў, праведзеных аматарамі гістарычнага мінулага паселішча, некалькі тэатральных пастановак, два запісаныя аўдыёдыскі, экскурсіі.

Але на гэтым Фэст не заканчваецца! Праз тыдзень (з 29 красавіка па 1 мая) ўсе зацікаўленыя змогуць сустрэцца з экскурсаводамі на вуліцах сваіх гарадоў.

Таму сачыце за інфармацыяй на сайтах tut.by і tio.by ці звяніце каардынатару па Мінску Цімоху Акудовічу (МТС 557 11 24), каардынатар у рэгіёнах – аўтар гэтага допісу (МТС 277 29 44).

Наста КАДЫГРЫБ

Веснавая абрадава-святочная культура Чарнобыля

Вытокі архетыпаў праславянскай культуры на тэрыторыі сучаснага Чарнобыльскага рэгіёну маюць міфалагічнае паходжанне і разнастайна прадстаўляюць матрыманіяльны характар асноўных праславянскіх абрадавых з'яваў: веснавых, траецка-сёмушных, купальскіх, жніўных, восеньскіх, калядных, шчадроўных і многіх іншых. Гэта дазваляе аднесці іх да найбольш старажытнага перыяду развіцця чалавечай агульнасці – матрыярхату і найстаражытнейшага земляробчага перыяду станаўлення мастацкай традыцыі ў культуры, які падпарадкаваны сонечнаму кругавароту і развіваўся ад вясны да зімы. Праславянскімі цэнтрамі эпохі стала альтэрнатыва «цяпло-холад», а таму развіццё яе пачыналася з вясны.

Вербніца. У цэнтры ўвагі гэтага перадвелікоднага свята вярба – дрэва, якое распускаецца першым і перш за ўсё на беларускім Палессі. Цяпер жартам, а раней з магічнай мэтай распушчаным пучком сцябалі адзін аднаго. Хваставі вярбой таксама жывёлу, асабліва моцна сцябалі дзяцей, каб тыя раслі здаровымі.

Пры гэтым прыгаворвалі: «Не я б'ю – вярба б'е; Будзь жывуча, як вярба; Будзь прыгожа – як вясна!» І жартавалі: «У адну нядзелю вярбой б'юць, у другую – яйка дадуць».

Вербніца, нядзеля перад Вялікаднём, мела яшчэ назвы Вербіч, Вербная нядзеля, Вярбіца і была пачаткам перадвелікоднага Вербнага, Жарснага, Страснога тыдня. У гэты дзень у царкве і ў наш час асвячаюць галінкі распушчанай вярбы, якімі сцябаюць адзін аднаго з прыгаворам: «Вярба б'е, не я б'ю, за тыдзень – Вялікдзень, будзь здароў, не ўмірай, Вялікадня дачакай, ужо недалечка чырвона яечка. Будзь здаровы, як вада, і як лёд на ўвесь год! Будзь багаты, як зямля! Будзь прыгожы, як вясна! Клапатлівы будзь, як лета! Будзь заможны, як восень!» і г.д.

У народных павер'ях вярба асэнсоўвалася як жыццядзейнае, жыццястойкае дрэва, якое засцерагае ад хваробаў і нечысці. Таму яе асвечанымі галінкамі абавязкова пахлёствалі хворых, дзяцей, старых і нават жывёлу, каб засцерагчы іх ад ліхога вока, хваробаў, варожых сілаў, драпежнікаў. Вярбе прыпісваліся здольнасці спрыяць плоднасці, урадлівасці, памнажэнню, дабрабыту. Для гэтага з'ядалі па пупышцы асвечанай вярбы, каб не балелі зубы і для засцярогі ад ліхаманкі. Іх клалі ў ваду, калі купалі хворае дзіця. Каб абараніцца ад маланкі, на Вербніцу ўсе члены сям'і з'ядалі па адной пупышцы асвечанай вярбы, а гаспадар з прыгаворамі абыходзіў сцёбаючы ўсю жывёлу, пабудовы, вуллі, агарод, поле, магілы продкаў. Рэшткі вярбы захоўваліся да наступнай Вербніцы. Галінкі асвечанай вярбы, як і грамнічныя свечкі і купальскія зёлкі, цэлы год ужываліся пры розных гадавых, сямейных і афіцыйных урачыстасцях як сакральныя, магічныя, ахоўныя.

Валачобніцтва.

На вяліка свята,
на Вялікдзень,
Вясна красна на ўвесь свет!
Ішлі, прыйшлі валачобнічкі.
Дачакаліся светлых
святочкаў.
Светлых святочкаў –
велікоднічкаў:
Першага свята –
святога Вялічка.
Другога свята –
святога Юр'я.
Трэцяга свята –
святога Міколу.

У веснавой святочнай традыцыі красавік звычайна адзначаны трыма найважнейшымі веснавымі перасоўнымі святамі нашага народа: Звеставаннем, Вербніцай і Вялікаднём. Апошні, як галоўнае нацыянальна адметнае свята беларусаў, звычайна прыпадае на красавік. Таму што Вялікдзень-Пасха, які беларусы адзіныя са славянаў захавалі як сустрэчу новага года па самым старажытным сонечным календары, залежны яшчэ і ад месяцовага календара, а таму ў хрысціянскія часы павінен быў быць паміж поўняй (ветахам) і маладзіком (думаецца, што ў дахрысціянскія часы ён святкаваўся ў дзень веснавога раўнадзенства, 20–21 сакавіка).

Вялікдзень заключае самы доўгі 7-тыднёвы Вялікі пост, які пачынаецца Шыльным панядзелкам-паласказубам.

Галоўным момантам падрыхтоўкі святочнага стану душы да Вялікадня якраз і быў папярэдні сямітыднёвы пост, Велікодная ноч з суботы на нядзелю – Усяночная, калі не спалі, палілі вогнішчы, фарбавалі яйкі, пяклі пірагі, таўклі мак, цёрлі хрэн, рыхтавалі «паску» з сыра, якія зранку асвячалі ў царкве і разгаўляліся пасля набажэнства ў гонар уваскрасення Хрыстова. Пасля гэтага ўсе тройчы віталіся радаснай навіной «Хрыстос уваскрос!» і тройчы цалаваліся.

Пасля разгавення святочна апранутыя людзі выходзілі на вуліцы з поўнымі кішэнямі выбраных моцных крашанак (за курамі, якія неслі іх, быў асаблівы нагляд) і пачыналі шматлікія гульні з біццём і качаннем яек

Пры гульні ў біткі трэба быць вельмі пільным, таму што бываюць «злодзеі», якія робяць яйкі-падробкі з воску, волава, але, калі падман расчуць, а пасля абеда скачуць» – у аўторак на паслявелікодным Фаміным тыдні. Калі ўлічыць факты святкавання Наўскага Вялікадня амаль на ўсіх старажытна племянных беларускіх тэрыторыях, а Радуніцы – на сумежжы з рускімі рэгіёнамі, асаблівае месца велікоднага тыдня ў календары беларусаў, чацверка ў паўсядзённым побыце, то трэба прызнаць самабытна беларускім прысваткам менавіта Наўскі Вялікдзень. Ёсць шмат сведчанняў, што гэта было свята ўшанавання памерлых у апошні час, нават у апошні год, аб чым сведчыць і сама сутнасць наўскіх рытуалаў з абавязковым частаванням Дзядоў велікоднымі яйкамі.

Гэты абрад народжаны сямейна-родавай традыцыяй ушанаваць і ўлагодзіць душы продкаў, якія адпаведна сакральным звычаям яшчэ матрыярхальнага ладу могуць уплываць на лёс сваіх кроўных нашчадкаў.

Звычайна на Наўскі Вялікдзень перад абедам усе кроўныя, па-велікоднаму святочна апранутыя, з фарбаванымі яйкамі і ўсімі асвечанымі на Вялікдзень стравамі ішлі на могілкі. Старэйшыя і дзеці моўчкі рассаджваліся вакол белага абруса, які слалі на папярэдне старанна дагледжаную магілку апошняга нябожчыка ў родзе. На абрус клалі куццю, яйкі, вялічку, мяса, хрэн, рыбу, пітво, «грыбкі» – тоўстыя бліны. Усе стравы абавязкова адкладаліся ці адліваліся для нябожчыка і пакідаліся на магіле пасля наўскага пачастунку. Ён працягваўся доўга, а пачынаўся звычайна гаспадаром, які звяртаўся з наступнай прамовай-рацыяй:

Святыя Дзяды,
Што ад нас паляцелі,
Хадзіце да нас,
Будзем есці, што бог паслаў!

Далей ішло ўшанаванне памерлага: успаміналі яго лепшыя якасці, таму свята яшчэ названае Вялікаднём для продкаў. Абавязковым было галашэнне – плач, якое адносілася непасрэдна да гэтага родзіча. У галашэннях-зваротах вылівалі ўсе свае крыўды, скаргі, гора.

Пасля абеду рэшткі ежы аддаваліся жабракам, асабліва тым, якія спявалі старэцкія песні і ў гэты дзень прыходзілі на могілкі. Доўга развітваліся з родзічамі, звярталіся да іх з пажаданнямі «лёгкага спачыванняйка, вечнага адпачыванняйка», хоць некаторыя, няўцешныя ў горы, маглі затрымацца каля магіл да вечара. Увогуле, Наўскі Вялікдзень быў вельмі падобны да сапраўднага Вялікадня, бо ўжо ў нядзелю дзе-нідзе сіроты-валачобнікі на могілках спявалі валачобныя песні – звароты да памерлых бацькоў.

Пасля могілак па дарозе дадому моладзь і дзеці вадзілі некаторыя магічныя веснавыя карагоды («Пасеялі дзеўкі лён» – каб ён добры вырас). Застолле часцей за ўсё прадаўжалася і дома, але ўжо ў больш вясёлай форме – са спевамі, танцамі, гульнямі («па абедзе скачуць»), адбываліся кірмашы, але гэта не было святатацтвам, а мела рытуальнае значэнне пераадолець смерць, не дапусціць страху перад ёй у душы людзей, сцвердзіць жыццёвы аптымізм.

У святе Наўскага Вялікадня яскрава ўвасобіўся выразна гуманістычны дух нашага народа, які аб'ядноўваецца ў вельмі ёмістым і глыбокім паняцці «Дзяды». У іх беларусы бачылі свае жыццёвыя карані, моц традыцыі, значыць, і народа, аснову выхавання новага пакалення праз адбор лепшага ад мінулага, павагу да бацькі-маці, дзеда-бабулі, настаўніка, старшага чалавека, разумнай дзяржавы. Яшчэ сто гадоў таму было адзначана: «Варта запытацца, дзе больш павагі і любові да памерлых родных і продкаў, дзе больш разумення духоўных зносін з імі, дзе, нарэшце, больш паэзіі – ці ў людзей адукаваных, якія спачатку паплачуць, потым памоляцца і хоць зрэдку ўспомняць, але якія прыйшлі ў жах, калі б хто з мерцвякоў задумаў бы да іх з'явіцца; ці ў гэтым народзе, які ўсёй душой іх заклікае, верыць, што яны прыходзяць, і лічыць гэта за шчасце. Так званы "просты люд" зразумеў і пачуў патрэбу ісці па слядах продкаў, і для гэтага неабходна пастаяннае адзінства з імі».

Радуніца. Рытуальнае ўшанаванне нябожчыкаў на Радуніцу, спачатку на памежжы з Расіяй, а цяпер і на ўсёй тэрыторыі Беларусі, адбываецца ў аўторак паслявелікоднага Фамінога тыдня, але яно як бы выпадае з агульнабеларускай традыцыі штосуботняга ўшанавання дзядоў. Гэта пацвярджаецца і прызначэннем аўторка сярод іншых дзён тыдня: адпаведна народнай традыцыі лічылася, што ў аўторак трэба было пачынаць новыя значныя справы: будоўлю дома ці іншых гаспадарчых пабудоваў, заворваць ніву, пачынаць засеўкі ці зажынкі, нават хадзіць у сваты і інш. Але гэтая традыцыя ў постчарнобыльскія часы становіцца ўсё больш папулярнай.

Васіль ЛІЦЬВІНКА
(Паводле кнігі «Фальклор і этнакультура Чарнобыля»)
Фота Леаніда БАРОЎСКАГА

Велікодны тыдзень на Тураўшчыне

Да продкаў, дзеля памяці

Выйшла кніга – і адразу рэдкае выданне

Нататкі пра бібліяфіла і рупліўца

Гэты артыкул напачатку планаваўся як расповед пра новую кнігу. Ды часцяком бывае, што «суровая праўда жыцця» ўносіць свае карэктывы. Гэтак атрымалася і з кнігаю Міхася Казлоўскага «Пра кніжнікаў і кнігі», якая мае падзагаловак «Нататкі бібліяфіла, эпісталярная спадчына». Пастаянныя чытачы нашай газеты ведаюць гэтага рупліўца на краязнаўчай ніве. Ён ужо даўно выдае альманах «Куфэрак Віленшчыны», а таксама кнігі пра выдатных асобаў і мясціны Беларусі.

Варта пачаць, што вывучэннем беларускай культуры і краязнаўствам М. Казлоўскі займаецца даўно. У 1980–1990-я гады ён, малады рабочы аднаго з прадпрыемстваў Маладзечна, стварыў патрыятычную суполку «Беларуская хатка». І мяне рэдакцыя газеты для беларусаў замежжа «Голас Радзімы» выправіла ў камандзіроўку: «Трэба з'ездзіць і напісаць пра гэтую цікавую асобу. Рабочы цікавіцца нашымі гісторыяй, традыцыямі, культурай, з сябрамі ладзіць імпрэзы». Пабачанае і пачутае ўразіла, захапіла – і вынікам стала вялікая газетная публікацыя. І расповеды сябрам і знаёмым пра цікавага чалавека. На што адзін з аспірантаў акадэмічнага Інстытута літаратуры Алесь Бяляцкі зазначыў: «Дык ён папросту не губляе час, самаадукоўваецца, набіраецца неабходных ведаў, каб потым іх скарыстоўваць, дзяліцца імі». Як бачым, гэтак і сталася.

У новай кнізе сабраныя расповеды пра беларускіх збіральнікаў беларускай кнігі з розных рэгіёнаў, а таксама пра выдавецтвы і кніжныя знакі, экслібрысы. Нават добра вядомыя асобы – мастак Мікола Малевіч (гэта ён некалі шыкоўна праілюстраваў аповесць М. Лынькова пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў), літаратары і навукоўцы Вацлаў Ластоўскі, Мікола Каспяровіч і Мікола Шчакаціхін, святары Леў Гарошка, Чэслаў Сіповіч і Уладзіслаў Чарняўскі – паўстаюць у іншым абліччы. Як вялікія аматары і збіральнікі кніг. Асобныя старонкі прысвечаныя асобам менш вядомым ці зусім невядомым шырокаму колу, але гэта – шчырыя рупліўцы-збіральнікі. Аўтар расказвае пра Пётру Зяновіча, Барыса Пятроўскага, Віктара Казлоўскага, Язэпа Гладкага, Юльяна Сергіевіча ды іншых людзей, якія ўсё жыццё не толькі збіралі свае бібліятэкі, але і вывучалі, даследавалі кнігу. Пішучы пра кожнага, М. Казлоўскі прыводзіць цікавыя гісторыі з іх жыцця, распавядае пра свае сустрэчы з імі, праводзіць своеасаблівую экскурсію да іх кніжных шафаў ды стэлажоў. Цікавая гісторыя збору, пабачанага аўтарам у далёкай Амерыцы ў доме Надзеі Касмовіч, якая паходзіць з роду Міцкевічаў, што даў свету Якуба Коласа. Цэлы раздзел – пра экслібрысы – мог бы быць прысвечаным знанаму літаратару, краязнаўцу і кнігазбіральніку Сяргею Панізьніку. У многіх успамінах багата гумару, трапных назіранняў, не бракуе і амаль дэтэктыўных гісторыяў ды сумных развагаў.

Экслібрыс М. Каспяровіча (мастак Яфім Леснін)

Экслібрыс А. Мальдзіса (мастак Вячка Целеш)

Многія героі яго кнігі ўжо сышлі. Па-рознаму склалася гісторыя іх бібліятэкаў. На жаль, часцяком яны станавіліся мала патрэбныя спадкаемцам, ці і зусім залішнім грузам. У лепшым выпадку, распавядае Казлоўскі, даводзіцца знаёміцца з багатым зборам, звалены дзесьці на паддашку драўлянага дома ці гаспадарчае пабудовы, нашчадкі пагаджаюцца што-ніштo прадаць ці падараваць зацікаўленай асобе...

Вялікая частка прысвечаная кніжным знакам і экслібрысам. Гэта своеасаблівая гісторыя кнігавыдання ў Беларусі – ад пачатку мінулага стагоддзя. Чытаеш пра пэўнае выданне і разумееш – аўтар ведае, пра што піша, мае ў сваёй калекцыі і гэтую кнігу, і тую, і іншую. Падаецца ці то падрабязнае апісанне вокладкі, ці малюнка экслібрыса, ці распісваецца стан пэўнага асобніка.

Добрай дапамогаю тут – падборка ілюстрацыяў да кожнага раздзела. У кнізе шмат фотаздымкаў бібліяфілаў, падаюцца вокладкі розных выданняў, экслібрысы. Праўда, магло б быць іх і болей. Часцяком, чытаючы пра штосьці, лез у ілюстрацыйную частку, а там – няма адпаведнай выявы. Гэтую ды іншыя заўвагі я выказаў М. Казлоўскаму. І пачуў звыклае ўжо тлумачэнне – брак грошай. Кнігі гэты руплівец беларушчыны выдае за свае сродкі, якіх часцяком не хапае. Таму даводзіцца чымсьці папусціцца, нешта пакінуць па-за старонкамі выдання... Думаю, з гэтым сутыкаліся многія чытачы нашай газеты, якія спрабавалі выдаваць свае даследаванні пра родныя мясціны. Ад гэтага – і невысокія наклады: 300 асобнікаў, 200, 100, нават – 50. «Краязнаўчая газета» імкнецца па-магчымасці знаёміць чытачоў з гэтымі выданнямі, друкаваць урыўкі з некаторых, каб яшчэ больш зацікаўленых людзей пазнаёміліся з імі.

Наклад кнігі Міхася Казлоўскага – 100 асобнікаў, якія амаль адразу ж сталі бібліяграфічнай рэдкасцю. Хаця з-за тэмы зацікавілі вялікую колькасць людзей, калі без праблемаў разышоўся б наклад і ў паўтысячы асобнікаў. Мяркую, што кніга можа прыдацца не толькі асобным чытачам, але і ў бібліятэках (у тым ліку – школьных), для студэнтаў філалагічных і гістарычных факультэтаў, універсітэта культуры, паліграфічных навучальных установаў ды інш., бо многія раздзелы – своеасаблівы дапаможнік па гісторыі беларускай кнігі,

такі сабе працяг знакамітай працы Вацлава Ластоўскага «Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі».

У савецкія часы выходзілі спецыялізаваныя выданні кшталту «Альманаха бібліяфіла», у розных газетах і часопісах існавалі адпаведныя рубрыкі. На жаль, цяпер такіх публікацыяў вобмаль. А цікавасць да іх вялікая, што паказаў і пэўны ажыятаж вакол выдання Міхася Казлоўскага. У інтэрнэце пад час абмеркавання навіны пра кнігу было нямала заўвагаў кшталту «значыць, шукаць яе ў кнігарні няма сэнсу:(». І сапраўды, кніга разышлася. Шукаючы яе на просьбу каляжанкі-журналіста, звярнуўся да аўтара, але той толькі скрушна адказаў: «Няма». Праўда, адно з выдавецтваў зацікавілася кнігаю Міхася Казлоўскага, каб перавыдаць яе. Думаецца, што другое выданне будзе дапоўненае і пашыранае, знойдзецца таксама магчымасць даць большую колькасць ілюстрацыяў. А тое, што і яно будзе запатрабаванае, дык гэта дакладна.

Вось і згадваецца тут практыка кнігавыдання ў розных краінах. Там можа выходзіць невялікі пробны наклад, і калі ёсць попыт, то друкуецца дадатковы вялікі наклад. Прычым, часта гэта можа быць і за сродкі выдаўцоў, друкарні, бо пралічана, што праект можа стацца камерцыйна выгодным, а выдаткі акупяцца. У нас жа, выглядае, нават акупляльныя выданні так і застаюцца пробнымі – з іх маленькімі накладамі. Аўтары-краязнаўцы пасля напісання і падрыхтоўкі кнігі да выдання ашчаджаюць грошы ці шукаюць фундатараў, уціскаюць напісанае ў сродкі, што маюцца, а потым часта яшчэ і распаўсюджваюць іх (а то і раздорваюць). Такі вось бізнес... Лішне казаць, што пра нейкія ганарары размовы няма.

Таму і застаецца захапляцца тымі даследчыкамі-краязнаўцамі, якія нават у такой сітуацыі не кідаюць улюбёны занятак, не лічацца з выдаткамі, сапраўды «невзирая на неблагоприятные условия» працягваюць Вялікую і Высакародную Справу. Шкада, што не ўсіх імёны на слыху.

Уладзімір ПУЧЫНСКІ

М. Шчакаціхін у працоўным кабінеце

Ілюстрацыя М. Малевіча да аповесці М. Лынькова

Сяргей ПАНІЗЬНІК

Веставы

Міхасю Казлоўскаму – выдаўцу часопіса «Куфэрак Віленшчыны», «Выбраных твораў» Віктара Вальтара, аўтару кніг «Галасы разбуджаных птушак» (2006), «Нашчадак слаўных крывічоў» (2008), «Пра кніжнікаў і кнігі» (2010)

Міхась жыве пад Звонам.
Не з роду асначоў,
а кніжным плытагонам
ён славіць крывічоў.
Міхась жыве між
птушак.
Разбуджаныя ім,
яны вяртаюць душы
на продкавы кілім.
Ён ажыўляе позвы,
каб жыццяпісаў стос
не засмакталі освы...
Наш Мацярык пад знос
не пойдзе! Служыць
кніжнік
у Памяці ганцом
і грэе свет нябліжні
пад вокладкай-вянцом.
З яго куфэркаў скарбы
і я прымаць гатоў.
Цаню: не змёрлі фарбы
разбуджаных гадоў.
Шчаслівей, Маладзечна,
у абдоймах Міхася.
Хай стане Кнігай Вечнай
і Беларусь уся!

Зрабіў беларусаў відушчымі

Да 90-годдзя з дня нараджэння Міколы Ермаловіча

29 красавіка нашаму выдатнаму гісторыку, літаратару, аўтару навуковай канцэпцыі ўтварэння Беларускай дзяржавы Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ) Міколу Іванавічу Ермаловічу спаўняецца 90 гадоў з дня нараджэння.

Вялікага гісторыка-самавука з філалагічнай адукацыяй, які не меў высокіх вучоных ступеняў і званняў, многія сучаснікі называюць апосталам гістарычнай праўды нашай Радзімы. Той самай праўды, якая на працягу дзесяцігоддзяў была схаваная для беларусаў, праўды, якая была абылганая, знявечаная. М. Ермаловіч, амаль невідушчы, у сваіх творах апісаў гісторыю беларускай сярэднявечнай дзяржавы – Вялікага Княства Літоўскага, і вярнуў нам, відушчым, памяць і гонар за нашую Радзіму. Так, мы некалі звалiся ліцвінамі, а беларусамі нас пачалі называць па «міласці» валадароў Расійскай Імперыі з XVII стагоддзя. Нашая дзяржава ВКЛ была высокацывілізаванай еўрапейскай краінай з развітым пісьменствам, высокай культурай, з мужнымі ваярамі – абаронцамі Радзімы. Прайшло ўжо больш за 20 гадоў з часу выхаду ў свет вядомай кнігі М. Ермаловіча «Па слядах аднаго міфа», якая развянчала ілжывую канцэпцыю так званых «гісторыкаў» аб тым, што ВКЛ стварылі продкі жыхароў памежнай дзяржавы, што нашыя суседзі некалі гаспадарылі на нашых землях, і толькі гуманныя ўсходнія суседзі вызвалілі нашую краіну ад іга літоўцаў. Але і зараз некаторыя нашыя грамадзяне, якіх не хочацца называць словам «суайчыннікі», сцвярджаюць гэтую самую лухту. А ім падпяваюць і некаторыя «замежныя «добразычліўцы, якім гэтая лухта выгадная, бо надае велічы іхняй краіне. Такіх людзей яшчэ больш за 100 гадоў таму наш вялікі пясняр Янка Купала называў ворагамі беларушчыны. Нездарма сярод свядомых беларусаў існуе показка: «Радавод у нас адзін, // Тыя ж і паводзіны. // Толькі я люблю Радзіму, // А ты любіш Родину».

Выступаюць В. Жыбурт, М. Нарэйка і П. Русаў

Аб усім гэтым і шмат аб чым іншым з жыцця і творчасці гісторыка вялася гутарка ў час прэзентацыі нядаўна выдадзенай кнігі «Мікола Ермаловіч», якая адбылася 7 красавіка на яго радзіме ў Дзяржынску. На сустрэчу з чытачамі горада і раёна прыехалі з Мінска вядомыя ў Беларусі асобы: галоўны рэдактар выдавецтва «Кнігазбор», укладальнік і аўтар каментароў да кнігі Кастусь Цвірка, паэт Міхась Скобла, краязнаўца Анатоль Валахановіч, гісторыкі Леанід Акаловіч і Пятро Русаў. Усе гэтыя людзі былі знаёмыя з М. Ермаловічам, сябравалі з ім, і іхнія ўспаміны выклікалі вялікую цікавасць. Аб папулярнасці імя М. Ермаловіча сярод чытачоў Дзяржыншчыны сведчыла тое, што чытальная зала бібліятэкі не змагла ўмясціць усіх ахвочых папрысутнічаць на цікавым мерапрыемстве. М. Скобла адзначыў, што Мікола Ермаловіч са сваім дрэнным зрокам зрабіў відушчым беларускі народ. Калі паэт жыў у Заслаўі, яму часта даводзілася ехаць да Мінска на электрычцы разам з Міколам Іванавічам. Ён успомніў, што калі гаворка ў вагоне заходзіла аб Вялікім Княстве Літоўскім, то заўсёды знаходзілася шмат спадарожнікаў, якія з вялікай цікавасцю слухалі прамоўцу – Міколу Ермаловіча. Неяк М. Скобла вылічыў, што каб працаваць амаль штодня ў мінскай бібліятэцы з архіўнымі і летапіснымі матэрыяламі, Мікола Іванавіч затраціў на дарогу з Маладзечна і назад больш за 18 тысячаў гадзінаў. А. Валахановіч успомніў, з якімі цяжкасцямі давялося сустрэцца, каб надрукаваць першую кнігу Міколы Ермаловіча «Па слядах аднаго міфа». Яна выйшла ў 1989 годзе ў выдавецтве «Навука і тэхніка», дзе ў той час працаваў загадчыкам аддзела А. Валахановіч. Прысутныя на прэзентацыі даведаліся, што М. Ермаловіч сябраваў з выдатнай беларускай паэткай Ларысай Геніюш, ліставаўся з ёй, прыязджаў да яе ў Зэльву.

Л. Акаловіч, А. Валахановіч, К. Цвірка, М. Скобла

П. Русаў з'явіўся на сустрэчу са сваёй неразлучнай спадарожніцай – гітарай і з вялікім майстэрствам праспяваў свае песні на словы Янкі Купалы і Алеся Пісьмянкова, за што быў узнагароджаны бурнымі апладысментамі. На сустрэчы выступілі таксама загадчык музея сярэдняй школы вёскі Вялікія Навасёлкі Вячаслаў Кавалеўскі і галоўны бібліёграф бібліятэкі, паэтка Вольга Жыбурт. Вельмі слушнай прагучала прапанова аб наданні Дзяржынскай раённай бібліятэцы імя Міколы Ермаловіча. Напрыканцы сустрэчы ахвочыя, а іх было шмат, змаглі набыць кнігу «Мікола Ермаловіч» з аўтографам К. Цвіркі. Дырэктар бібліятэкі Валянціна Клімовіч падзякавала гасцям і чытачам за цікава праведзеную сустрэчу, а ўсе прысутныя павіншавалі гасцінную гаспадыню з днём яе нараджэння.

Трэба дадаць, што кніга выйшла дыхтоўным томам. У ёй змешчаныя: прадмова гісторыка Анатоля Грыцкевіча, грунтоўная праца М. Ермаловіча «Беларуская дзяржава Вялікае Княства Літоўскае», а таксама гутаркі і вершы, крытыка, публіцыстыка, ліс-

ты М. Ермаловіча, якія раней не друкаваліся.

Напярэдадні гэтага мерапрыемства прэзентацыя кнігі «Мікола Ермаловіч» адбылася і ў родным кутку гісторыка – вёсцы Вялікія Навасёлкі. У перапоўненай зале вясковай школы вучань 11 класа Максім Нарэйка прадэкламаваў глыбока патрыятычны верш Міколы Ермаловіча «Жыве Беларус». Некалькі яго вершаў прачытала госця з Мінска – педагог, грамадская дзяячка Надзея Сармант. Выступілі таксама А. Валахановіч і П. Русаў. Затым Вячаслаў Кавалеўскі (загадчык установы) азнаёміў гасцей з музеем, які заснаваў брат Міколы Леанід Ермаловіч і дзе ёсць экспазіцыі, прысвечаныя братам Ермаловічам: гісторыку, літаратару Міколу, вопытнаму педагогу, удзельніку Вялікай Айчыннай вайны Леаніду і рэжысёру, удзельніку вайны Валянціну.

Паважаюць жыхары Вялікіх і Малых Навасёлак сваіх выдатных зямлякоў. Засмучае толькі тое, што цэнтральная вуліца Малых Навасёлак, дзе нарадзіліся выдатныя сыны нашай Айчыны Мікола, Леанід і Валянцін Ермаловічы, як называлася вуліцай Ленінскай, так і называецца. Але перайменаванне вясковай Ленінскай вуліцы ў вуліцу Міколы Ермаловіча ці братоў Ермаловічаў павінна быць ініцыятывай мясцовай грамадскасці. А пакуль, як пісаў Уладзімір Караткевіч: «Спіць народ, быццам зелле ў раллі».

Няўжо не абудзімся, га?

Лявон ЦЕЛЕШ

Вяліканавасёлкаўская школа: фота на памяць

Да рэактара было рукой падаць...

З успамінаў ліквідатара краснапальчаніна Мікалая Мікалаевіча Лазарэнкі

Мікалай Лазарэнка нарадзіўся і вырас у Краснаполлі, скончыў сярэднюю школу. Пасля службы ў арміі на нейкі час застаўся ў Кіеве, уладкаваўшыўся ў абласное ўпраўленне грузавога аўтатранспарту, дзе і працаваў у той час, калі 26 красавіка 1986 года адбылася аварыя на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі.

Лёсам яму было наканавана стаць ліквідатарам вынікаў аварыі на ЧАЭС. Ужо 2 мая 1986 года ў складзе аўтакалоны вайсковага тыпу ён прымаў удзел у эвакуацыі жыхароў Чарнобыльскага раёна з небяспечнай зоны, калі рэактар яшчэ працягваў выкідваць радыеактыўныя рэчывы. Жыць тут было небяспечна, эвакуявалі 45 тысячаў жыхароў толькі з г. Прыпяць. Дазвалялася браць самае неабходнае, бо ўсё было забруджанае радыяцыяй. Ён успамінае:

«...Нас сюды ўпаўнаважылі з місіяй правесці эвакуацыю людзей, хто па адвечнай звычайнасці і гэтай вясной збіраўся сеяць, бо на кожным падворку стаялі мяхі з насеннай бульбай, ля брамак дыхалі тлустым свежым пластом першыя ўскапаныя градкі. І калі сказалі людзям пра тое, што трэба пакуль згарнуць усе клопаты, бо небяспечна цяпер тут пасля аварыі, яны змяніліся ў твары – ні ўсмешкі, ні адказу, адно – паніклы погляд убок, у бязлікую далячынь...

– Ды ніякай тут радыяцыі няма, глупства ўсё, – згадваю словы аднаго з калгасных жывёлаводаў. – Лёгка сказаць – ехаць, а каму гэта ўсё пакінуць? Сеяць трэба, поле паспела...

Стаялі мы тады насупраць іх – здаровых, надзейных, здольных і ўпэўненых у сабе палешукоў, глядзелі ў іх вільготныя ад слёз вочы і разумелі, наколькі гэта цяжка вось так адразу, імгненна адарвацца ад усяго спрадвечнага, роднага, што называецца сваім, і кінуцца з голымі рукамі ў свет невядомы.

Уздымаючы радыяцыйны пыл, туды-сюды снавалі машыны, мітусіліся на падворках людзі, гналі на пагрузку жывёлу, якую вывозілі з небяспечнай зоны. Раўлі каровы, вішчалі свінні, гулі натужна маторы машын. Край мяняў сваё аблічча, пусцеў і станавіўся самотна шэрым.

Апошні аўтобус з людзьмі пакінуў вёску апоўначы.

У прыцемках мутнелі дарогі, і грувасткімі космамі наваколле брала ў свой палон радыяцыйная атрута. І ўсё тут імгненна рабілася не такім, як звычайна. Гаркота паветра зводзіла сківіцы, драла глотку, сушыла рот так, што і калодзежная вада не брала яе.

Помніцца, стаім прыкладна за 10 кіламетраў ад Чарнобыльскай атамнай станцыі ля вясковага клуба, гутарым паміж сабой, і тут пад'язджае да нас ваенны УАЗ. Палкоўнік у палявым абмундзіраванні адчыняе дзверцу і кажа:

– Мужыкі, а вы ведаеце, колькі тут рэнтген? Хавайцеся ў памяшканне, вельмі небяспечная радыяцыя.

А потым працягнуў нам сваю фляжку, прапанаваў спірт.

– Пакуль гэта адзіны паратунак, вазьміце пакрысе...

Перад маімі вачыма да гэтага часу карціна тых дзён. У памяці гучаць трывожныя словы маці: «Напішы, сынок, дзе ты будзеш», «Беражы, дачушка, сябе», «Мы вас знойдзем, мы да вас прыедзем»...»

З 6 па 15 мая Мікалай зноў працаваў у Прыпяці, адкуль да пашкоджанага рэактара было рукой падаць – 3,5 км. Тут тады быў такі высокі ўзровень радыяцыі, што, як сцвярджаюць вучоныя, у гэтым горадзе нельга будзе жыць яшчэ каля 100 гадоў.

З 8 па 21 жніўня 1986 года М. Лазарэнку зноў накіроўваюць у Прыпяць на 14 дзён, а 24–25 жніўня камандзіроўка была прадоўжаная. Амаль месяц працягвалася яго цяжкая праца ў 30-кіламетровай зоне. Пра здароўе ніхто не клапаціўся. Замераў радыяцыйнага апраменьвання ніхто не рабіў, згоды на працу не патрабавалі, а накіроўвалі па загадзе начальніка аўтапрадпрыемства.

Вось выпіска з загаду № 15 ад 6 мая 1986 года Ірпенскага аўтапрадпрыемства, дзе тады працаваў М. Лазарэнка:

«Согласно распоряжения Киевского областного управления грузового автотранспорта приказываю:

1. Командировать на ликвидацию последствий аварии на ЧАЭС в г. Припять сроком на 10 дней – с 06 по 15.05.1986 г. водителя автоколонны № 4 Лазаренко Николая Николаевича.

Начальник Ирпенского автопредприятия 11065 А.Н. Шкаривский».

А вось што пра той час успамінае сам М.М. Лазарэнка: «У першыя дні пра выбух на ЧАЭС нічога не ведалі. 31 красавіка атрымалі і прыгналі новыя грузавыя аўтамашыны – чэхаславацкія "Татры". Для чаго – таксама не падазравалі. Потым быў выхадны, адпачывалі дома. Да мяне прыехаў начальнік транспартнага аддзела і сказаў, каб я сабраў сваю брыгаду, бо трэба 2 мая ехаць працаваць у Чарнобыль. Я быў брыгадзірам брыгады вадзіцеляў з 10 чалавек. У той дзень нам ніхто не сказаў, якой будзе работа. Мы ўспрынялі гэта як чарговую камандзіроўку, бо да таго часу яшчэ не ведалі пра выбух на атамнай станцыі. Аўтамашыны нованыя, колы, як кажуць, круцяцца. Калі ўжо прыехалі на разгрузачную станцыю Вільча, там нам растлумачылі, што мы будзем рабіць, і выдалі рэспіратары. А работа чакала такая: вазіць свінец у Прыпяць пад верталёты. Там верталёты загружаліся і ляцелі да разбуранага выбухам чацвёртага блока атамнай станцыі. На ўсё жыццё застануцца ў памяці тыя дні, калі давялося вазіць гэты незвычайны груз. "Татры" былі разлічаны на 16 тон. Салдаты тэрміновай службы загружалі свінцовыя пліты ўручную. Кожная важыла па 60 кілаграмаў. Везлі гэты груз праз Чарнобыль на Прыпяць, дзе на спецыяльным аэрадроме нас чакалі верталёты. Свінцовыя пліты ўкладвалі ў мяшкі і загружалі ў верталёты, потым скідвалі ў рэактар, каб заглушыць радыеактыўнае выпраменьванне».

На пытанне, ці ведаў ён аб небяспецы, якая пагражае здароўю ў забруджанай зоне, Мікалай Мікалаевіч адказаў: «Ніхто нават і не думаў аб гэтым. Для нас гэта была звычайная работа. Рэспіратары мы надзявалі толькі ў Прыпяці. Мы яшчэ нават і не ўсведамлялі ў той час, што такое радыяцыя».

М.М. Лазарэнка расказаў таксама аб сваіх уражаннях у час першых рэйсаў: «Едзем, а насустрач тэхніка з людзьмі, жывёлай... Як быццам бы вайна... А ўжо пазней – навокал пустэча. Нібы вымерлыя вёскі, апусцелыя палі. А яшчэ больш жудасна ўначы, гэта ўжо ў жніўні, калі быў там другі раз: едзеш, вакол цемра, а пад колы аўтамашыны, у святло фар, кідаецца штосьці, не зразумееш адразу: сабака ці кот. І міжволі толькі сэрца замірае – а раптам чалавек! Пакінутая свойская жывёла, сабакі і каты, напэўна, ад поўнай бязвыхаднасці, наўмысна кідаліся пад колы аўтамашын, каб скончыць самагубствам. Іншага вываду нельга было і зрабіць.

А работы прыходзілася выконваць розныя. Вазілі ў Прыпяць не толькі свінец, але і мармуровую крошку, гэта ўжо ў мяшках, і загружалі яе пагрузчыкам. Працавалі пазменна, на кожную аўтамашыну было па 2 вадзіцелі».

Як расказаў М.М. Лазарэнка, некаторы час давялося яму працаваць і на будаўніцтве новай дарогі. Для адселеных чарнобыльцаў быў пабудаваны горад Славуціч, а вось дарогі да яго добрай не было.

З тых далёкіх гадоў Мікалаю Мікалаевічу запомнілася і прыемнае. У жніўні ў Чарнобыль прыехала з канцэртам Ала Пугачова. Прама на вуліцы была падрыхтавана спецыяльная пляцоўка, дзе і праходзіў бясплатны канцэрт для тых, хто там працаваў. «Зараз, калі прайшло столькі гадоў, усё асэнсоўваецца па-іншаму, – гаворыць М.М. Лазарэнка. – А тады пусты горад, насельніцтва даўно эвакуіравана, а мы сядзім і слухаем канцэрт. У той час гэта не выклікала нейкіх асаблівых пачуццяў – проста невялікі адпачынак».

Пасведчанне ліквідатара М.М. Лазарэнка атрымаў ужо ў Краснаполлі, дзе ён таксама працягваў работу па ліквідацыі вынікаў аварыі на ЧАЭС: вазіў пліты і іншыя будматэрыялы з Магілёва, прадукты харчавання ў забруджаныя вёскі, потым перавозіў перасяленцаў з вёсак Мхінічы, Сасновіца, Высокі Борак, Беразякі ў Брэсцкую вобласць, Мінск і Мінскую вобласць.

Лёс ліквідатараў – незайздросны. Яны рызыкавалі сваім здароўем, каб выратаваць людзей ад бяды. З гадамі Чарнобыль усё больш нагадвае ім пра сябе, усё часцей прыходзіцца звяртацца па дапамогу да дактароў, спыняць працу і шукаць паратунак для ўласнага жыцця.

Пройдуць гады, але ніколі не сатрэцца з памяці Чарнобыль. І толькі ўспаміны ліквідатараў яшчэ не раз нагадаюць аб тых падзеях.

Леанід ЛАБАНОЎСКІ
(Паводле кнігі "Краснаполле: у промнях Чарнобыля")

Гдзень

Каля мяжы з Украінай за некалькі кіламетраў ад ракі Прыпяць і горада Чарнобыль шырокімі вянцамі-вуліцамі раскінулася вёска Гдзень. Калісьці яна была шматлюдная і прыгожая. Сёння ў ёй жывуць толькі каля сотні жыхароў. Яны адмовіліся з'ехаць з забруджанай зоны пасля красавіцкіх падзеяў 1986 года. Зараз жыццё ў вёсцы падтрымліваюць іх дзеці і ўнукі. Вельмі ціха на вуліцах вёскі, трухлеюць дамы, ператвараюцца ў руіны калгасныя забудовы. Побач знаходзіцца тэрыторыя Палескага дзяржзапаведніка, таму ваўкі зімой, а дзікі ўвосень – не рэдкія госці на яе вуліцах.

Славутае мінулае ў вёскі. У Вялікую Айчынную вайну два яе сыны сталі Героямі Савецкага Саюза, а колькі дасягненняў было ў народнай гаспадарцы! Шмат легендаў – жартоўных і рэалістычных – складзена пра яе жыхароў. Вось, напрыклад, жарт пра баявітасць гдзенцаў (яны вызначаліся бойкасцю, і за гэта суседзі звалі іх «байцамі»).

Два гдзенцы стаяць у армейскім страі. Пад'язджае машына, выходзіць з яе генерал і кажа:

– Добры дзень, таварышы байцы!

Са строю, пасля вітання:

– А адкуль вы даведаліся, што мы гдзенцы?

Адкуль такая рыса ў маіх землякоў? Можа, легенда, пачутая калісьці ў дзяцінстве, гэта патлумачыць?

Вельмі даўно тут было мала паселішчаў. Панад Дняпром і Прыпяццю густыя гаманкія бары шумелі ды прасціралася дрыгва з купкамі асакі і маленькімі астраўкамі. Але неспакойна жылося на гэтай зямлі: дружыны князёў то з захаду, то з усходу набягалі па даніну, рабавалі людзей.

Адзін такі атрад некалі і прайшоўся па правым беразе Прыпяці: гналі яны першай справай палонных, звязаўшы вяроўкамі ды лыкавымі пасамі па некалькі чалавек. Тут каля цяперашняга Чарнобыля, на высокім беразе ракі напаткала іх ноч. А ноч, як вядома, каму вораг, а каму сябра. Але як ні пільнавалі вартавыя здабычу, і за імі сачылі ўважлівыя вочы. Знайшліся сярод палонных моцныя духам, прагныя да жыцця і волі. Перацерлі яны лыкавыя путы, дапамаглі іншым вызваліцца і ўсе разам кінуліся з высокага берага Прыпяці. А тыя хто не змог выратавацца і застаўся, усё роўна былі зранку скінутыя ў раку разлютаванымі катамі. Некаторыя кідаліся самі, а іншых збівалі і кідалі мёртвымі. Вось такая чорная быль пасялілася ў памяці жыхароў. З таго часу, кажуць, узнікла на тым месцы паселішча, потым яно выросла ў горад, які назвалі – Чарнобыль.

Не чакалі каты такога павароту падзеяў. Разлютаваныя, яны яшчэ не раз вярталіся ў пошуках уцекачоў. Гойсаючы па абшарах, па дрыгве, яны самі не раз траплялі ў пастку, клікалі на дапамогу. І чулася тады ў наваколлі пытанне-заклік: «Ты гдзе-е-е?».

Ўцекачы, праблукаўшы некалькі дзён па незнаёмых мясцінах, далей адышлі ад жахлівага месца і апынуліся на беразе ціхай рачулкі, якая цяпер завецца Брагінкай. Перад імі раскінуліся шырокія палі і лугі, а галоўнае – дрыгва, азёры і шматлікія скрытыя калдобіны, нябачныя чужынцам, былі добрай схованкай ад ворагаў. Тут яны збудавалі сабе дамы, выросла новае паселішча. Доўга яно заставалася без назвы. Але аднойчы адзін з насмешнікаў, расказваючы пра блуканні дружыннікаў у наваколлі, перадражніў: «Гдзе-гдзе-гдзе...». І дадаў: «А нядрэнна нам і тут жывецца, у нашай гдзене». Так і сталі называць сваё паселішча.

В. КАВЯРДА,
г.п. Камарын
Брагінскага раёна

У тэатры «Зьніч»

У пачатку мая Беларускі паэтычны тэатр аднаго актора «Зьніч» зноў чакае сваіх гледачоў.

5 мая маленькіх гледачоў запросяць з сабой у падарожжа галоўныя героі лялечнага монаспектакля **«Пра ката Сафрона і пеўніка Андрона»** ў выкананні Леаніда Сідаровіча.

10 мая на сцэне тэатра апынецца **«Маленькі анёлак»**, лёгкая незямная істота з крылцамі, апекуна забытых жывёлаў. Бог пусціць яго на зямлю пашукаць самую няшчасную істоту. Монаспектакль паводле вершаў Кармэн Барнос дэ Гаштольд у выкананні Раісы Астрадзінавай.

12 мая на сцэне Малой залы імя Р. Шырмы Вячаслаў Статкевіч пры музычным суправаджэнні Сяргея Сарокіна (гітара) адыграюць музычна-паэтычны спектакль па творах М. Багдановіча **«У краіне светлай...»**.

16 мая ў лялечным монаспектаклі **«Граф Глінскі-Папялінскі»** будзе расказаная незвычайная гісторыя пра двух сяброў – хлопца Марціна і ката Максіма. Лялькамі гуляе Вячаслаў Шакалідо.

Увечары гледачы змогуць павандраваць у пошуках Радзімы, «новай зямлі» з галоўным героем Міхалам у спектаклі **«Красёнцы жыцця»**, пастаўленага паводле славутай паэмы Якуба Коласа «Новая зямля». Выканаўца Алесь Кашпераў.

Спектаклі (акрамя асобна пазначаных) праходзяць у Тэатральнай зале культурнага цэнтра касцёла Св. Сымона і Св. Алены. Дзіцячыя пастаноўкі пачынаюцца а 15 гадзіне, вечаровыя – а 19-й. Дадатковую інфармацыю можна атрымаць па мінскім тэлефоне (017) 331-75-53.

У Нацыянальным гістарычным музеі адкрылася выстаўка еўрапейскіх мастакоў XVII–XVIII стст. «Ван Дэйк і яго эпоха» са збору Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея. Асноўную частку экспазіцыі складаюць 30 гравюраў вядомага фламандскага мастака Антоніса ван Дэйка (1599–1641), вучня і паплечніка знакамітага мастака Пітэра Паўля Рубенса (1577–1640). За 20 гадоў творчага жыцця мастак стварыў больш за 900 палотнаў і незлічоную колькасць гравюраў.

Галерэя прадстаўленых на выстаўцы партрэтаў падзяляецца на тры групы: манархі і палкаводцы, дзяржаўныя дзеячы і філосафы, мастакі і калекцыянеры. Акрамя таго, у экспазіцыі прадстаўлены афорт мастака на рэлігійную тэму, а таксама працы паводле малюнкаў Рубенса. Сярод іншых мастакоў выстаўляюцца працы фламандца Пітэра Паўля Рубенса, швейцарца Іагана Каспара Фюслі, немца Іагана Купецкага, француза Жана Баціста Гроза, галандцаў Герарда Доўва і Іагана Фрыдрыха Баўзэ і інш.

Цікавая гісторыя з'яўлення знакамітай калекцыі ў Беларусі. Зробленыя ў XVII ст. афорты былі набытыя Гродзенскім музеем у прыватнага калекцыянера ў 2001 годзе. Больш за тры гады спатрэбілася, каб пацвердзіць іх сапраўднасць. У выніку шматлікіх даследаванняў, а таксама на аснове спектраграфічнага аналізу, праведзенага Інстытутам малекулярнай і атамнай фізікі НАН Беларусі, было пацверджана, што гравюры выкананыя на паперы XVII стагоддзя. Нямала часу спатрэбілася і на складанне поўнага апісання гравюраў з максімальна поўнай інфармацыяй пра адлюстраваных асобаў. Выстаўка «Ван Дэйк і яго эпоха» ўжо з поспехам экспанавалася ў трох музеях Польшчы, Літвы і ў Віцебску.

Копія аўтапартрэта А. ван Дэйка (дапісаная рэстаўратарам Б. Кудзінавым

Зм. ВОЖЫК

Зорка Палын

Уздоўж

1. «Чорны ... апякае грудзі. // Лёгка каля продкаў тут заснуць». З верша Ніны Аксёнчык «Перасяленне». **4**. Прафесія першых ліквідатараў чарнобыльскай катастрофы, многія з якіх хутка загінулі. **9**. Прыстасаванне для біялагічнай ачысткі забруджаных водаў. **12**. ..., або прывід. Тое, што ўяўляе сабой зараз некалі прыгожы горад Прыпяць. **13**. Едкі пах ад няпоўнага згарання чаго-небудзь. **14**. Адзін або некалькі герметычна ізаляваных правадоў. **17**. «Ёсць карта, // Дзе нельга збіраць ..., // Дзе могуць магілы выпрастваць гарбы». З верша Рыгора Барадуліна «Дазвол». **18**. Высокі слуп для розных мэтаў. **21**. Прадстаўнік народнасці цюркскай моўнай групы. **23**. Рака на Гомельшчыне, левы прыток Прыпяці. **25**. Канат для буксіроўкі. **27**. «Права на ...». Кніга журналісткі, пісьменніцы, грамадскай дзяячкі Ніны Рыбік, ураджэнкі адселенай хойніцкай вёскі. **29**. «... – нябачны акупант». Верш Анатоля Грачанікава «За ракою пыхае АЭС». **30**. «Чорнай вясёлкай вісеў тэлемост // ... – Чарнобыль». З паэмы Уладзіміра Някляева «Зона».



Упоперак

1. Трагедыя Уладзіміра Губарава пра падзеі на Чарнобыльскай АЭС у першыя дня пасля катастрофы. **2**. «Пажарнікі – заложнікі прагрэсу – // Ад цела аддзіралі з мясам ...». З верша Сяргея Законнікава «Чорная быль». **3**. ..., або бессаромнасць. Паводзіны тых, хто сцвярджае, што на зямлі Беларусі больш не існуе небяспекі ад вынікаў Чарнобыльскай катастрофы. **5**. Жоўтае рэчыва ў птушыным яйку. **6**. «Я ўзіраюся ў зорнае ... // Над мёртвымі вёскамі Гомельшчыны і Магілёўшчыны». З верша «Пілоту» Алы Канапелька, ураджэнкі Хойнікшчыны. **7**. Тое, што і кацельная. **8**. Асадкавая горная парода. **10**. Лячэбная ўстанова з бальнічнымі ложкамі. **11**. «Ад Чарнобыля ў небе плыве ..., // А па лузе ідуць хлапчынё і дзяўчынка». З верша Генадзя Бураўкіна. **15**. «Дзяўчына ад шчасця спявала. // Стронцый ... у дажджы». З верша Уладзіміра Караткевіча «Дзяўчына пад дажджом». **16**. «... гэтай зоркі Чарнобыль». Назва кнігі Алеся Адамовіча. **19**. Асоба, што піша пратакол сходу. **20**. Апошняя нядзеля перад Вялікаднём, калі асвячаюць у царкве галінкі вярбы. **22**. Разумны, мудры чалавек. **24**. «Зорка ...». Кантата кампазітара Дзмітрыя Даўгалёва. **25**. Падземнае жалезабетоннае ўкрыцце. **26**. Месца спуску (разм.). **28**. «А ... хойніцкім ці брагінскім наўрад // Малітвамі аплакаць невяртанне». З верша Ніны Аксёнчык «Палессе роднае, жыві!»

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ

Красавік

1 – Лойка Алег Антонавіч (1931, Слонім – 2008), пісьменнік, літаратуразнаўца, крытык, які зрабіў значны ўклад у вывучэнне тыпалагічных сувязяў беларускай і польскай літаратураў, аўтар звыш 100 навуковых працаў, у т.л. манаграфіяў і падручнікаў для вышэйшай школы, член-карэспандэнт НАН Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Якуба Коласа (1990) – 80 гадоў з дня нараджэння.

3 – Бекю Аўгуст (1771, Гродна – 1824), вучоны-ўрач, які адзін з першых у Беларусі і Літве пачаў вакцынацыю супраць воспы – 240 гадоў з дня нараджэння.

3 – Жавускі Генрык (1791–1866), польскі пісьменнік, публіцыст, аўтар гістарычных твораў, прысвечаных ВКЛ; стваральнік мастацкіх вобразаў дзеячаў беларускай культуры – 220 гадоў з дня нараджэння.

3 – Канстытуцыя 3 мая 1791 г., асноўны закон Рэчы Паспалітай (1791–1793) – 220 гадоў з часу прыняцця.

4 – Рунец Пятро (Пётр Мікалаевіч; 1911, Пухавіцкі р-н – 1997), пісьменнік, які пісаў пераважна для дзяцей, творчым подзвігам якога з'яўляецца складанне кнігі дзіцячых успамінаў пра вайну «Ніколі не забудзем» (разам з Янкам Маўрам), што вытрымала восем выданняў на беларускай мове і перакладзена на многія іншыя мовы; перакладчык з рускай, украінскай, латышскай і чувашскай моваў – 100 гадоў з дня нараджэння.

5 – Борзабагаты Уладзіслаў Канстанцінавіч (1831, Навагрудскі р-н – 1886), рэвалюцыянер-дэмакрат, удзельнік паўстання 1863–1864 гг. на Беларусі, мемуарыст, імем якога названая вуліца ў Навагрудку – 180 гадоў з дня нара-джэння.

5 – Булацкі Рыгор Васільевіч (1921, Бабруйскі р-н – 1999), вучоны ў галіне гісторыі журналістыкі, адзін з заснавальнікаў беларускай школы журналістыкі, аўтар больш за 200 навуковых працаў, у т.л. манаграфіяў, падручнікаў і вучэбна-метадычных дапаможнікаў, педагог, першы дэкан факультэта журналістыкі БДУ, лаўрэат прэмій Саюза журналістаў СССР і БССР – 90 гадоў з дня нараджэння.

5 – Якавенка Васіль Цімафеевіч (1936, Светлагорскі р-н), празаік, нарысіст, драматург – 75 гадоў з дня нараджэння.

Па апошнім снезе...

Здаецца, зусім нядаўна на палетках ляжаў снег, трымаў марозік, ледзь-ледзь прыгравала сонейка і ўсе чакалі прыходу вясны.

Сёння амаль і следу не засталося ад зімы: па вуліцах шпарка бягуць ручайкі, паўсюдна чутно шчабятанне птушак, а ў паветры – водар вясны...

У адзін з такіх сонечных красавіцкіх дзянькоў вучні Лужаснянскай гімназіі на чале з настаўнікам гісторыі, кандыдатам гістарычных навук, вядомым краязнаўцам Мікалаем Півавaрам збіраліся ў паход па ваколіцах пасёлка Лужасна. Перад адпраўленнем, па прапанове Мікалая Васільевіча, усе ўдзельнікі сталі ў кола і пазнаёміліся: кожны называў сваё імя, адкуль ён, прыдумваў слова на англійскай мове, якое пачыналася б з першай літары яго імя. Гэта было вельмі цікава і весела.

Першым пунктам, да якога направіліся «паходнікі», стала чыгуначная станцыя «Лужасна». Дарэчы, на ёй у 1940 годзе была зафіксаваная самая нізкая тэмпература – мінус 44°С. Да станцыі мы ішлі ўздоўж чыгункі, любаваліся прыродай, атрымлівалі асалоду ад птушыных спеваў, а хлопчыкі нават з горкі пакаталіся. Па дарозе Мікалай Васільевіч распавядаў розныя цікавыя гісторыі і падбадзёрваў жартамі.

Мінуўшы станцыю, накіраваліся да аб'екта геалогіі, які застаўся ў выніку раставання ледавіка, – марэннай грады. Але, каб патрапіць на яе, нам давялося перайсці Крывы ручай. Ён бярэ пачатак са Святой крыніцы каля вёскі Суднікі (у ёй нарадзіўся Ф.А. Сурганаў, былы старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР). Пераход ручая таксама не абышоўся без гумару, асабліва боязна было пераходзіць дзяўчатам. І вось мы на месцы. Перад намі распасціралася вялізная прастора з жывапісным ландшафтам. Але паколькі снег ужо амаль не трымаў і ісці было не вельмі зручна, мы хуценька перабраліся на падсохлыя ўжо праталіны, а затым на дарогу і прадоўжылі свой паход.

Далей наш шлях ляжаў да той самай Святой крыніцы. На жаль, з-за моцнага раставання снегу мы не змаглі блізка падысці да яе. Паглядзеўшы на крыніцу з пэўнай адлегласці, мы накіраваліся дадому.

На гэтым і скончылася нашая невялічкая вандроўка, якую паміж сабой мы назвалі паход «Па апошнім снезе». Усе былі вельмі задаволеныя цудоўнай веснавой прагулкай.

Вялікі дзякуй нашаму супер-экскурсаводу Мікалаю Півавару за такі цікавы, вясёлы, пазнавальны паход!

Вольга БЕЗДЗЕЛЬ,
студэнтка гістфака ВДУ імя П.М. Машэрава

Адказы на крыжаванку, змешчаную ў № 13

Уздоўж: **1**. Дыпламат. **4**. Аптымізм. **9**. Авен. **10**. Плоў. **11**. Аквамарын. **12**. Выгада. **14**. Кот. **15**. Муслін. **19**. Удача. **20**. Кітай. **23**. Адвага. **25**. Ода. **27**. Спячка. **29**. Сланечнік. **31**. Веер. **32**. Жарт. **33**. Крышталь. **34**. Азярніцы.

Упоперак: **1**. Драбавік. **2**. Плед. **3**. Морква. **5**. Турызм. **6**. Іглу. **7**. Мяўканне. **8**. Гумно. **13**. Адгадка. **16**. Святыня. **17**. Мак. **18**. Акт. **21**. Красавік. **22**. Блакітны. **24**. Адліга. **26**. Дзева. **27**. Свіння. **28**. Белы. **30**. Шалі.

Малая краязнаўчая энцыклапедыя

Пачатак у № 1 за 2003 год)

ЛЕ́ПЕЛЬ – горад, цэнтр раёна, на беразе Лепельскага возера, паміж рэкамі Ула і Эса. Канцавая станцыя чыгункі Орша–Лепель. За 115 км на паўднёвы захад ад Віцебска, аўтамабільнымі дарогамі звязаны з Полацкам, Мінскам, Віцебскам, Оршай, Улай.

У цэнтральнай і паўночнай частцы вострава на Лепельскім возеры насупраць в. Стары Лепель знаходзяцца селішча і замчышча, што атаясамліваюць з паселішчам Лепель (Лепля).

Паводле пісьмовых крыніцаў вядомы з 1439 г., калі князь Міхаіл, сын вялікага князя ВКЛ Жыгімонта Кейстутавіча, падараваў Стары Лепель віцебскаму касцёлу. У 1541 г. Жыгімонт I Стары перадаў яго Віленскай капітуле. Тут пабудаваны замак, які ў 1563 г. спалены. У 1568 г. пачалося будаўніцтва новага драўлянага замка (прамавугольны ў плане, з 4 вугламі вежамі, не збярогся). Горад складаўся з 2 частак: замка і «места» (заснаваны ў 1563 г. на поўначы ад замка, у 1580 г. было 300 двароў, размешчаных на востраве і заходнім беразе возера Лепельскае), якія злучаліся мостам праз вадзяны роў. Горад стаяў на скрыжаванні вялікіх гандлёвых гасцінцаў: з Віцебска на Вільню і з Магілёва на Дзісну і Рыгу. Каля замка знаходзіўся гандлёвы порт, адкуль адпраўляліся тавары ў Рыгу, Полацк, Кіеў. З 1586 г., калі Стары Лепель перайшоў да падканцлера ВКЛ Л. Сапегі, горад перанесены за 5 км у в. Белае (вядомая з 1-й пал. XVI ст., належала Сапегам), тут пабудаваны замак, царква, касцёл, крамы. Узнікла мястэчка Белы, або Новы, Лепель (пазней Лепель). Стары Лепель паступова занепаў і ператварыўся ў вёску.

У 1772–1776 гг. – адміністратыўны цэнтр Полацкага ваяводства. З 1793 г. у складзе Расійскай Імперыі, горад, цэнтр павета. У 1797–1805 гг. непадалёк ад яго пабудаваны Бярэзінскі канал. Горад упрыгожылі масты, набярэжныя. У 1805 г. перададзены ў казну. У Айчынную вайну 1812 г. панёс вялікія страты. Моцна пацярпеў ад пажару 1833 г. У 1835 г. распрацаваны генплан забудовы горада. У 1841–1844 гг. пастаўлены мураваны праваслаўны сабор. У 1876 г. пабудаваны мураваны касцёл Св. Казіміра (закладзены ў 1857 г.). У 1852 г. зацверджаны герб горада – «Пагоня».

У 1897 г. у Лепелі 6284 жыхароў, у пач. XX ст. прыкладна 770 дамоў, працавалі 12 дробных прадпрыемстваў (25 рабочых), 7 ніжэйшых навучальных установаў, друкарня. 4 разы на год праводзіліся кірмашы. У 1911–1913 гг. выдавалася газета «Лепельский вестник»; у 1920–1921 гг. выходзіла Лепельская «Стенная газета "РОСТА"».

З 1924 г. цэнтр раёна і ў 1935–1938 гг. цэнтр акругі. У 1939 г. было 13,8 тыс. жыхароў. У 1938–1941 гг. існаваў Лепельскі калгасна-саўгасны тэатр, створаны ўдзельнікамі мастацкай самадзейнасці. У Вялікую Айчынную вайну з 6 ліпеня 1941 г. да 28 чэрвеня 1944 г. акупаваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

У 1959 г. жыло 9,7 тыс. чалавек, у 1970 – 13,1 тыс. З 7 сакавіка 1963 г. – горад абласнога падпарадкавання.

У горадзе шмат памятных месцаў, звязаных з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны. У гарадскім скверы на магілах Героя Савецкага Саюза А.Ф. Данукалава, камандзіра Лепельскай партызанскай брыгады Д.Ц. Караленкі, сакратара Лепельскага падпольнага РК КПБ(б) А.А. Марунькі ўсталяваныя помнікі. На Прывакзальнай плошчы – помнік на брацкай магіле 600 савецкіх воінаў і партызанаў. У парку – помнік савецкім воінам, партызанам і падпольшчыкам, якія загінулі пры вызваленні раёна.

У 2009 г. у горадзе 18,6 тыс. жыхароў. Пры Доме культуры працуе народны тэатр «Пошук». Захаваліся касцёл Св. Казіміра (2-й пал. XIX ст.) і Параскева-Пятніцкая царква (пач. XX ст.)

На невялікім востраве возера Лепельскае і на востраве (плошча каля 25 га) насупраць в. Стары Лепель 2 гарадзішчы III–IV ст. н.э. культуры штрыхаванай керамікі.

4 лістапада 1953 г. заснаваны раённы краязнаўчы музей (адкрыты 8 снежня 1954 г.). У экспазіцыі адлюстраваная гісторыя краю ад старажытнасці да нашых дзён. У выставачнай зале рэгулярна праходзяць выстаўкі рознай тэматыкі. З 2004 г. праводзіцца краязнаўчая навукова-практычная канферэнцыя «Лепельскія чытанні».

Замчышча ў Старым Лепелі

Касцёл Св. Казіміра

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 15 мая 2009 г.
Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры», вытворчае прыватнае унітарнае прадпрыемства «Светач», Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.
Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.
Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Андрэй Вірчак, Анатоль Грыцкевіч, Алесь Карлюкевіч, Лідзія Кулажанка, Адам Мальдзіс, Вячаслаў Рагойша, Віталь Скалабан, Віктар Хурсік.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Траецкая набярэжная, 6. Тэл. 283 28 26, 334 61 62. Тэл./факс 334-42-03 E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас. Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. Пры перадруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 21.04.2011. Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14). Ліцэнзія ЛП № 02330/ 0150475 ад 25.02.2009.

Заказ 433. Тыраж 1160 асобнікаў.